На секции «Пушкин и белорусская литература» с докладом «Пушкин и белорусская поэзия XIX века» выступил доктор филологических наук Н. М. Гринчик. Зарождение и развитие белорусской поэзии XIX века проходило под все возрастающим воздействием классических традиций и особенно традиций Пушкина. Наиболее полно этот процесс выявился в сфере утверждения исходных идейно-эстетических принципов молодой национальной литературы — принципов народности и реализма. Кандидат филологических наук А. О. Шелемова в сообщении «Романтический герой в поэмах А. С. Пушкина и Я. Купалы» выдвинула проблему типологической соотнесенности романтических поэм классика белорусской литературы и южных поэм Пушкина. В сообщении преподавателя В. В. Коваленко «Пушкин и Богданович: некоторые аспекты типологической близости» продолжалось освещение темы влияния пушкинского гения на создание белорусской литературы. И Пушкин, и Богданович, стоявшие у истоков своих национальных литератур, творчески осваивали инонациональный материал более развитых литератур. В их поэзии очень велик объем «словно бы чужого», но это «чужое», переплавляясь силой таланта, становилось «своим», национальным.

Кандидат филологических наук И. Г. Степунин в своем выступлении «Пушкин и Белоруссия (по материалам ЦГИА БССР)» отметил некоторые методологические аспекты взаимосвязи изучения биографии поэта и литературного краеведения, которые имеют значение для изучения источников пушкинских замыслов.

Участники конференции высказали пожелание о регулярном проведении пушкинских конференций в Белорусском государственном университете имени В. И. Ленина, которые могли бы стать подлинными праздниками поэзии.

І. Р. СЦЯПУНІН

## «ПА ЎСЕМІЛАСЦІВЕЙШАМУ НАЙВЫСАЧЭЙШАМУ ЎКАЗУ»

У сваім артыкуле «Гістарычныя заметкі» А. С. Пушкін дае выключна яркую сацыяльна дакладную ацэнку каланізатарскай палітыкі імператрыцы Кацярыны II на Украіне і Беларусі.

Імператрыца знішчыла назву «рабства» і запрыгоніла «каля мільёна дзяржаўных сялян (гэта значыць вольных хлебаробаў)». З 1772 па 1796 год «па ўсеміласцівейшаму ўказу яе імператарскай вялікасці» беларускія землі «з ўсёй гаспадарчай маёмасцю» і «прыгоннымі душамі» былі раздадзены Р. П. Пацёмкіну, П. А. Румянцаву-Задунайскаму, П. А. Зубаву, С. Г. Зорычу і іншым фаварытам. Атрымаў беларускія землі і генерал-паручык Воін (Дарымедонт) Васільевіч Нашчокін (1742—1806), бацька сябра Пушкіна Паўла Воінавіча Нашчокіна.

Біяграфічныя звесткі пра В. В. Нашчокіна змешчаны ва ўспамінах сына. Вядомы тры варыянты гэтых успамінаў: запісы 1830 года самога Пушкіна, са слоў Нашчокіна (упершыню апублікаваныя ў 1847 годзе), запісы Нашчокіна 1836 года, якія былі дасланы Пушкіну для літаратурнай апрацоўкі (апублікаваныя ў 1936 годзе) і новы варыянт запісаў Нашчокіна, знойдзены Н. Я. Эйдэльманам («Прометей». 1974. № 10).

Генерал Нашчокін, як казаў Пушкін, быў адным з дзіўных людзей таго часу, ён меў вялікую схільнасць да эксцэнтрычных выхадак. Характар меў вельмі неўраўнаважаны, задзірысты і сварлівы. Ён быў «горды і запальчывы да крайнасці». Вядома яго рэзкае сутыкненне з А. В. Суворавым у снежні 1776 года ў Палтаве. Нашчокін трымаўся таксама дзёрзка з усемагутным Пацёмкіным і нават з самой Кацярынай II. А Паўлу I ён наогул адмовіўся служыць, гаворачы: «Вы гарачы і я гарачы, служба на карысць мне не пойдзе, разам мы не ўжывёмся». Са слоў Пушкіна, Нашчокін неаднаразова заяўляў, што нікому не хоча падпарадкоўвацца, «акрамя як самому сабе».

Нягледзячы на тое, што Нашчокін быў адным з магутных землеўладальнікаў Расіі, меў уладанні ў Варонежскай і Кастрамской губернях, Кацярына II дадаткова падарыла яму ў «вечнае радавое карыстанне» землі ў Себежскім павеце Віцебскай губерні. 31 кастрычніка 1789 года Полацкая намесніцкая палата паведамляла Полацкай грамадзянскай палаце пра «найвысачэйшы ўказ яе імператарскай вялікасці», па якому падораны генерал-паручыку і кавалеру Нашчокіну 27 вёсак у Себежскім павеце «з 700 душамі беларускіх сялян мужчынскага полу»[1].

«Найвысачэйшае дарэнне» не абышлося без канфлікту. Беларускімі землямі раней пажыццёва валодалі ваеннаслужачыя людзі, так званыя панцырныя баяры. Па волі гасударыні-імператрыцы яны засталіся без прытулку, былі пазбаўлены прыстанішча. Пакрыўджаныя спрабавалі пратэставаць супраць несправядлівасці. Сабраўшыся разам, яны заявілі капітану-ісправўніку Вікенцію Дарашкевічу, што не дапусцяць самавольства, ніхто не мае права прагнаць іх з законных земляў, яны гаварылі пра свае прывілеі за адданую службу пагранічнымі стражнікамі. Яны ахоўвалі граніцы ад нечаканага нападу непрыяцеля, пралівалі сваю кроў і як узнагароду атрымалі гэтыя землі, якія зараз незаконна збіраюцца ў іх забраць [2]. У панцырных баяр знайшліся заступнікі, іх падтрымлівалі беларускія сяляне. Баючыся «бунту», капітан-ісправўнік Дарашкевіч прапаноўвае пацярпеўшым звярнуцца ў Себежскі ніжні земскі суд. Панцырныя баяры падалі скаргу на найвысачэйшае яе імператарскае вялікасці імя [3]. Судовая цяжба цягнулася з 1789 па 1793 год. У цяжбу ўмяшалася сама імператрыца, якая, як агню, баялася новай пугачоўшчыны.

На аснове «ўсеміласцівейшага, найвысачэйшага ўказу» Себежскі земскі суд прыняў рашэнне «ў прашэнні панцырным баярам адмовіць, а землі аддаць ва ўладанне генерал-паручыку і кавалеру Нашчокіну». Па рашэнню суда капітан-ісправўнік Вікенцій Карчакоў спецыяльна звяртаўся да генерал-паручыка Нашчокіна з прашэннем, каб той «адразу ж уступіў у родавае валоданне падараванага маёнтка». Нашчокіну было таксама прапанавана «самому аб'ехаць свае землі і прыслаць свайго ўправіцеля»[4].

Характэрна, што сам Нашчокін не прымаў ніякага ўдзелу ў гэтай цяжбе, за яго ўсё вырашала імператрыца, якая праследавала карысную мэту — насадзіць на беларускіх землях сваіх «верных людзей», адданых царскаму трону. Себежскі павет, у які Кацярына II накіравала Нашчокіна, для царскай улады быў «неспакойным краем». Там хаваліся беглыя салдаты, якія не перанеслі ўсіх цяжкасцей царскай службы, паўстаўшыя сяляне часта нападалі на маёнткі памешчыкаў. Таму Кацярына прыняла ўсе меры, каб умацаваць сваё становішча ў гэтым краі.

Пасля смерці Нашчокіна (у 1806 годзе) беларускія землі перайшлі ў спадчыну да яго малодшай дачкі Ганны Воінаўны. Пасля яе смерці (у 1860 годзе), па завяшчанню, гэтыя землі перайшлі да сыноў Паўла Воінавіча — Аляксандра і Андрэя.

Ганна Воінаўна Нашчокіна падтрымлівала сваяцкія адносіны са сваім братам Паўлам Воінавічам, і, мабыць, ад яе сябар Пушкіна даведаўся пра беларускага шляхціца Паўла Астроўскага, які ў выніку судовага працэсу быў пазбаўлены дваранскіх правоў і стаў «чалавекам па-за законам». У 1832 годзе паліцыя Себежскага павета безвынікова шукала гэтага «ўцёкшага з астрогу разбойніка»[5], пра трагічны лёс якога складаліся вусныя расказы. Гісторыя Астроўскага стала вядома Пушкіну і паслужыла асновай для рамана «Дуброўскі».

[1] ЦДГА. Ф 3310, воп. 2, адз. зах. 35, л. 1—42.
[2] Там жа. Л. 34.
[3] Там жа. Л. 30.
[4] Там жа. Л. 29.
[5] Там жа. Ф. 1430, воп. 1, адз. зах. 2124, л. 451.